***Вот дождались и високосного февраля!***
***А он, мои друзья, богат литературными датами!***



***10 февраля исполняется 130 лет гениальному поэту и писателю России Борису Пастернаку.***

Борис Леонидович Пастернак – один из немногих российских мастеров слова, удостоенных Нобелевской премии. Его стихи и переводы вошли в золотой фонд русской и зарубежной литературы.

Всмотритесь в черты лица этого человека. В них и впрямь лежит печать гения!

Борис Пастернак родился 29 января 1890 г. в Москве в интеллигентной семье.

Мать – пианистка, отец - художник и член Академии художеств. Отец Бориса дружил со Львом Николаевичем Толстым и занимался иллюстрированием его книг.

С детства поэта окружала творческая атмосфера. Родительский дом был открыт для разных знаменитостей. Желанными гостями в нем были Лев Толстой, композиторы Скрябин и Рахманинов, художники Иванов, Поленов, Нестеров, Ге, Левитан и другие выдающиеся личности, общение с которыми не могло не повлиять на будущего поэта.

Огромным авторитетом для мальчика был Скрябин, под влиянием композитора длительное время он был увлечен музыкой и мечтал пойти по стопам своего учителя.

Борису пришлось сделать непростой выбор. Он осознавал, что, несмотря на безграничную любовь к музыке, на музыкальном поприще достичь высот не сможет, поэтому вынужден был отказаться от музыкальной карьеры.

В 1908 г. Борис становится студентом юридического факультета Московского университета, спустя год переводится на философское отделение. В 1912 г. поступает в Маргбургский университет. Пастернаку предсказывают успешную карьеру, но совершенно неожиданно он принимает решение стать поэтом, а не философом.

В начале 1930-х Пастернака и его творчество признает Советская власть. Сборники стихов переиздаются ежегодно, в 1934 году он выступает с речью на съезде Союза писателей. В 1935 году отправляется в Париж на Международный конгресс писателей в качестве лучшего поэта Страны Советов.

В этом же году Пастернак пишет письма Сталину с просьбой освободить арестованных сына и мужа Анны Ахматовой. Просьба поэта была исполнена.

Книга «Доктор Живаго» - одно из самых значимых произведений поэта в прозе, во многом это автобиографичный роман, над которым Пастернак на

протяжении десяти лет. Прототипом главной героини романа была его жена Зинаида Пастернак (Нейгауз).

Повествование романа начинается от начала века и заканчивается Великой Отечественной войной.

За правдивое отражение событий тех лет и свой собственный взгляд на происходящее писатель был подвергнут жестокой травле, а «Доктор Живаго» не признан руководством страны. В Советском Союзе роман не печатали, но его по достоинству оценили за границей. Изданный в Италии в 1957 г. роман «Доктор Живаго» получил шквал восторженных отзывов читателей и стал настоящей сенсацией.



В 1958 г. Пастернаку присуждают Нобелевскую премию. Роман переводится на многие языки и издается в Германии, Великобритании и Голландии.

А на родине составляются коллективные письма с требованием наказать провинившегося поэта.

Нашлись и те, кто предлагал выслать его из страны, но поэт не представлял себя без Родины. Свои горькие переживания этого периода он выражает в стихотворении «Нобелевская премия» (1959 г.), также опубликованном за границей. Под давлением массовой кампании от награды он был вынужден отказаться, а за стих его чуть было не обвинили в измене Родине. Бориса Леонидовича исключают из Союза писателей СССР.

Травля со стороны коллег и общественности сильно подкосила его здоровье. В апреле 1960 года у Пастернака развивается тяжелый недуг. Это была онкология с метастазами в желудке.

На его похороны, несмотря на недоброжелательное отношение властей, пришло много людей. Среди них были Андрей Вознесенский, Булат Окуджава, Наум Коржавин и другие.



Могила Поэта находится на кладбище в Переделкино.

Давайте почитаем стихи Пастернака!

Мело, мело по всей земле,
Во все пределы.
Свеча горела на столе,
Свеча горела.
Как летом роем мошкара
Летит на пламя,
Слетались хлопья со двора
К оконной раме.

Метель лепила на стекле
Кружки и стрелы.
Свеча горела на столе,
Свеча горела.
На озаренный потолок
Ложились тени,
Скрещенья рук, скрещенья ног,
Судьбы скрещенья.
И падали два башмачка
Со стуком на пол.
И воск слезами с ночника
На платье капал.
И все терялось в снежной мгле
Седой и белой.
Свеча горела на столе,
Свеча горела.
На свечку дуло из угла,
И жар соблазна
Вздымал, как ангел, два крыла
Крестообразно.
Мело весь месяц в феврале,
И то и дело
Свеча горела на столе,
Свеча горела.

Это строки положены на музыку и великолепно исполнены Аллой Пугачёвой.

Однажды поэт понял, что женщину нужно ценить вовсе не за наличие большого ума и образованности. Любовь – это великая тайна, которая не может быть основана на законах рассудка. И вот вам – истина в стихах:

Любить иных — тяжелый крест,
А ты прекрасна без извилин,
И прелести твоей секрет
Разгадке жизни равносилен.
Весною слышен шорох снов
И шелест новостей и истин.
Ты из семьи таких основ.
Твой смысл, как воздух, бескорыстен.
Легко проснуться и прозреть,
Словесный сор из сердца вытрясть
И жить, не засоряясь впредь,
Все это — небольшая хитрость.

И напоследок:

Гул затих. Я вышел на подмостки.

Прислонясь к дверному косяку,
Я ловлю в далеком отголоске,
Что случится на моем веку.
На меня наставлен сумрак ночи
Тысячью биноклей на оси.
Если только можно, Авва Отче,
Чашу эту мимо пронеси.
Я люблю Твой замысел упрямый
И играть согласен эту роль.
Но сейчас идет другая драма,
И на этот раз меня уволь.
Но продуман распорядок действий,
И неотвратим конец пути.
Я один, все тонет в фарисействе.
Жизнь прожить — не поле перейти.



## 16 лютага - 95 гадоў з дня нараджэння беларускага пісьменніка І. Навуменка (1925-2006)

Тэма вайны не магла не стаць адной з цэнтральных у творчасці чалавека, які зусім яшчэ хлопчыкам удзельнічаў у камсамольскім падполлі, ваяваў у партызанах і франтавой разведроце, змагаўся на Ленінградскім і 1-м Украінскім франтах.

Іван Якаўлевіч Навуменка з'яўляецца аўтарам апавяданняў, аповесцяў, раманаў, шматлікіх навуковых прац па праблемах станаўлення і развіцця беларускай літаратуры. Многія яго творы перакладзены на рускую, літоўскую, латышскую і іншыя мовы, некаторыя вядомыя чытачам краін далёкага замежжа.

Нарадзіўся Навуменка ў мястэчку Васілевічы Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і рабочага-чыгуначніка.



Жыццёвай школай будучага пісьменніка стала вайна з яе жорсткім, суровым вопытам. Горыч гэтай вялікай усенароднай драмы ён паспытаў спаўна. У сямнаццацігадовам узросце юнак уключыўся ў падпольную барацьбу з акупантамі, а затым працягнуў яе ўжо як разведчык дэсантнай групы, сувязны і баец.

Вярнуўшыся з вайны ва ўзнагародах, высокі і прыгожы старшына разведроты ажаніўся, як той

казаў, з ходу, не раздумваючы, пра што пазней нават успамінаць не любіў. Шлюб быў няўдалым.

....Іван Навуменка і Ядвіга Іконнікава пазнаёміліся ў Купалаўскім тэатры. Іван Якаўлевіч прызнаваўся, што звярнуў увагу на сімпатычную дзяўчыну таму, што ўжо вельмі заразліва, шчыра яна смяялася.

Да таго часу ў Івана быў няўдалы сямейны вопыт. Другі раз у загс не спяшаўся. Але ўсё ж не змог ўстаяць супраць жыццярадаснай Ядвігі, вырашыў рызыкнуць. І меў рацыю! Гэта было каханне на ўсё жыццё!

Пачаткам літаратурнай творчасці Навуменка лічыць 1955 г., калі ў часопісе "Маладосць" былі апублікаваныя творы "Сідар І Гараська" і "Эх, махорачка".

З 1957 г. кніга за кнігай выдаваліся зборнікі апавяданняў, навел і аповесцей пісьменніка.

Пяру Івана Навуменкі належаць шматлікія літаратурныя творы. Сярод іх апавяданні і аповесці «Семнаццатай вясной», «Хлопцы-равеснікі»,«Бульба», «Таполі юнацтва», «Вераніка», «Замець жаўталісця», «Пераломны ўзрост», «Водгулле далёкіх вёснаў».

Гэта аповесці для дзяцей «Вайна каля Цітавай копанкі», «Капитан Степь идет в разведку» (з В. Мамантавым)

Апавяданні і аповесці сталі для Навуменкі пачатковым этапам стварэння трылогіі аб Вялікай Айчыннай вайне, якую склалі раманы "Сасна пры дарозе", "Вецер у соснах", "Сорак трэці".

У творах І. Навуменкі праглядаецца лёс пакалення аднагодкаў аўтара, вобраз сямнаццацігадовага юнака, які сустракаецца з жорсткімі жыццёвымі выпрабаваннямі і, нягледзячы на супярэчлівасць лёсу, захоўвае рамантычны, часам летуценна-наіўны погляд на рэчаіснасць. Маладыя героі прозы Навуменкі праходзяць ваеннымі дарогамі, сядаюць на студэнцкую лаву, перажываюць радасці і расчараванні кахання. У раманах, напісаных у 1970-1980 гг., - "Смутак белых начэй", "Летуценнік", "Асеннія Мелодыі" - паўстае вобраз беларускага інтэлігента старэйшага пакалення, асобы надзвычай адчувальнай да дысгармоніі і дыскамфорту быцця, схільнага да балючай рэфлексіі. У гэтых творах даволі яскрава выяўлена прадчуванне таго пералому ў поглядах і этычнай арыентацыі, што ажыццявіцца у інтэлігенцкай асяроддзі ў 90-я гады.

Сучаснае жыццё з яго канфліктнай супярэчлівасцю асэнсоўваецца пісьменнікам у апошнім значным творы - трылогіі "Дзяцінства. Падлетак. Юнацтва".

Але, каб скласці сваё меркаванне, трэба чытаць творы пісьменніка.

Пачніце адразу і не пашкадуеце!



**20 лютага - 75 год з дня нараджэння Таісы Бондар,** беларускай пісьменніцы і перакладчыцы.

Бондар Таіса, нарадзілася 20.02.1945 г. у гарадскім пасёлку Рудзенск Мінскай вобласці.

У 1967 г. скончыла факультэт англійскай мовы Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў. Настаўнічала ў г. Фалешты (Малдавія).

У 1977 г. вярнулася ў Беларусь. у 1978-1981 гг. загадвала аддзелам выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва». З 1981 г. - загадчык аддзела культуры, адказны сакратар, а з 1985 г. намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Беларусь». Сябра СП СССР з 1978 г.

Найперш яна зарэкамендавала сябе як цікавы паэт. У друку з вершамі ўпершыню выступіла ў 1970 г. Потым былі выдадзены зборнікі паэзіі «Захапленне» (1974), «Акно ў восень» (1977), «...І голас набыла душа» (1980), «Святочны снег» (1981), «Чырвоны месяц года» (1985), «Спадчынны боль» (1987), «Адна» (1989).

Паспяхова і плённа працуе Таіса Мікалаеўна і як празаік. Яна аўтар кніг апавяданняў "Сінія яблыкі" (1984), аповесцей "Час, калі нас любілі" (1988), аповесцей і апавяданняў "Паветраны замак на дваіх" (1990), раманаў "Спакуса" (1989), "Ахвяры" (1994). Таксама былі выдадзены кнігі, "Бог зусім побач. Старонкі дзённіка" (2000), "Імем Айца і Сына" і раман-містэрыя "Павуцінне" (2004).

Тайна жаночай душы часцей за ўсё хвалюе Таісу Бондар. Пачуццё, якому героіні аповесцей і апавяданняў у пошуках шчасця аддаюцца самазабыўна, палка, натхнёна, нярэдка падманвае іх, але яны зноў і зноў імкнуцца ўдыхнуць у каханне жыццё, адагрэць яго - надзеяй ці ўспамінам.

Аб самой Таісе Бондар і яе творах вельмі ….. сказаў Арлен Кашкурэвіч:

*"…Таіса Бондар - чалавек складаны, з багатым унутраным жыццём. Гэта мужная, магутная асоба. Колькі трэба было мець душэўнай сілы, каб напісаць такі смелы, адкрыты і бязлітасны твор, як "Ахвяры"! У рамане паказаны жорсткая барацьба, немыя страсці, і трэба быць сапраўды чыстым і смелым чалавекам, каб напісаць падобнае. А яе паэзія... Пругкая, вірлівая - так і хочацца сказаць: вулканічная! - яна напоўнена энергіяй і дабрынёю. Чытаючы яе вершы, адчуваеш, як гэта энергія, не месцячыся ў радках, выплёхваецца са старонак, як цесна ёй у прасторы. Думаю, гэта ад перапоўненасці сэрца…"*

Святлом нетаропкага ціхага роздуму крануты вершы Таісы Бондар - яны быццам выпраменьваюць смутак, змушаючы задумацца, услухацца ў ледзь чутную хаду часу. Фарбы маленства - каханне - набліжэнне сустрэчы з Богам, з вечнасцю... Час становіцца шляхам, шлях шукае працяг у непражытым, лёс адгукаецца ў паэзіі - так можна было б вызначыць змест апошніх кніг пісьменніцы.

***Імя Бязмежжа... Формула Любві -***
***Душы, ўлюбёнай у Жыццё і Бога!***
***Куды б ні скіравалася дарога,***
***Усюды - Неба, вецер, галубы!***
***Ва ўсім - імкненне ўвысь,***
***насустрач промням,***
***Што караняцца ў горняй вышыні.***
***Штоміг у недасяжным іх агні***
***Згарае чыйсьці страх ці горкі спомін.***
***Штоміг якаясьці з зямных трывог***
***Не справай, дык учынкам прарастае -***
***І дабрыні паўсюдна прырастае...***
***А мы гаворым: усміхнуўся Бог.***

*********

***Самапрызнанні і самаўхваленні,***
***Аўтапартрэты на фоне вякоў...***
***Час, як і шлях, разабраны на звенні:***
***Мала абраннікаў, многа вянкоў.***
***Многа лухты і яе пазалоты -***
***Там, дзе павінны стаяць алтары***
***Новых мажлівасцей, новых палётаў***
***Духа, які ў сабе Бога адкрыў.***
***Бога - Любоў - неабдымную Існасць***
***Кожнай часцінкі Стварэння Яго...***
***Што для маштабаў такіх - рэчаіснасць***
***Шляху майго, існавання майго!***
***Шлях спакушае згарэць, растварыцца***
***Промнем у вечным патоку Святла -***
***Дух, дасягаючы першакрыніцы,***
***Бачыць Агонь пад наносамі тла.***
***Вечны Агонь, да якога імкнецца***
***Прагай Жыцця зачараваны свет,***
***Гэты, ці іншы ў бязмежным сусвеце...***
***Дух - яго водбліск,***
***палёт - Яго след.***

Мова – хіба ж не самы  значны скарб чалавека…..

Па прапанове Бангладэш, **у 1999 годзе ЮНЭСКА аб’явіла 21 лютага – Міжнародным днем роднай мовы.** Менавіта ў гэты дзень загінулі пяць студэнтаў, калі абаранялі свае правы вучыцца на роднай мове.

Агульная колькасць моў свету дакладна не вызначана з-за неакрэсленасці межаў паміж мовамі і дыялектамі, недастатковай вывучанасці некаторых моўных рэгіенаў. Лічыцца, што жывых моў Зямлі ад 3 да 5 тысяч і ад 6 да 8 тысяч дыялектаў.

Славянская мова – пятая па распаўсюджанасці на планеце група моў. На ей гаворыць больш за 300 мільенаў чалавек. Сення існуе 13 славянскіх нацыянальных літаратурных жывых моў: беларуская, руская, украінская, польская, чэшская  і другія.

Ільняная і жытневая,
Сялянская.
Баравая ў казачнай красе,
Старажытнейшая, самая славянская.
Светлая, як травы ў расе.
Вобразная, вольная , пявучая
Мова беларуская мая!        П. Панчанка.

Верай у адраджэнне роднай мовы прасякнута творчасць Я.Купалы, Я.Коласа, Цеткі, Вацлава Ластоўскага, Алеся Гаруна і многіх, многіх іншых пісьменнікаў Беларусі. Песняры, галасы і думкі якіх былі непадзельна звязаны з беларускай зямлей, мужна адстойвалі права беларусаў на карыстанне роднай мовай.

Мова – душа народа, векавая памяць многіх пакаленняў, наш галоўны нацыянальны скарб. Жыве мова – жыве памяць продкаў. Няма роднай мовы – няма народа, няма суцяшэння ў горы, няма слоў радасці.

І сення абавязак усіх нас – шанаваць родную мову, абараняць яе знявагі. Вось чаму многія беларускія пісьменнікіі звяртаюцца да нас, беларусаў, каб мы не цураліся роднага слова, а штодня размаўлялі на роднай мове.

Будзьце добрымі і шчырымі, любіце сваіх бацькоў, Радзіму! Не цурайцеся родных каранёў, памятайце, хто вы на гэтай зямлі!

Пагавары са мной на мове,
На нашай роднай, не чужой.
Адчуеш ты – у кожным слове
Душа яднаецца з душой.
І сэрца сэрцу адкрывае
Свае духоўныя сады –
Там салаўіны хор спявае,
Там смак крынічнае вады.
Там рэха продкаў прамаўляе
Малітвы светлыя здалек.
Нібыта нас благаслаўляе
На добры шлях. На лёгкі крок.

У словах тых надзеі нашы
І нашы мары пра жыццё.
Калі мы з мовай –
Нас не страшыць
Ні гвалт, ні мор, ні забыццё,
Пагавары са са мной на мове,
Забудзь на час пра “языкі”.
Няхай гучаць у кожным слове
І продкі нашы, і вякі!     І. Пракоповіч.

Беларуская мова - наша родная мова, адно з самых вялікіх тварэнняў беларускага народа, яго годнасць і слава! Колькі напісана і надрукавана на ей за некалькі стагоддзяў яе існавання.

У ЮНЕСКА лічаць, што да канца стагоддзя на Зямлі можа застацца толькі палова вядомых на сёння моў, і самыя вялікія страты чакаюць Афрыку, асабліва краіны поўдзень ад пустыні Сахара. Таксама вялікія страты панясуць народнасці Аўстраліі, Акіяніі і Паўднёва-Усходняй Азіі. А жыхары ЗША могуць страціць сотні моў карэннага насельніцтва краіны.

Дзе ж мы з вамі ў гэтым спіске?....




## 24 лютага - 85 лет з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна.

Нарадзіўся ў сям’і Івана Рыгоравіча і Акуліны Андрэеўны Барадуліных на хутары Верасоўка. У ў 1937 г. хутар быў ліквідаваны і сям’ю паэта перасялілі ва Ушачы. Дзед паэта па мамінай лініі Андрэй Гальвіньш быў этнічным латышом. Бацька загінуў у 1944 г. падчас Вялікай Айчыннай вайны у партызанскім атрадзе. Пасля вайны Рыгор Барадулін вучыўся ва Ушацкай сярэдняй школе (скончыў у 1954 г.), затым на філалагічным факультэце БДУ (скончыў у 1959 г.).

Працаваў у рэдакцыях газеты «Советская Белоруссия», часопісаў «Полымя», «Бярозка», «Беларусь», з 1969 г. у выдаведтве «Беларусь», з 1972 г. рэдактарам, затым загадчыкам рэдакцыі ў «Мастацкай літаратуры».

Першыя вершы апублікаваны ў 1953 г. (газета «Чырвоная змена»).

Узнагароджаны ордэнамі Дружбы народаў, «Знак Пашаны», медалём Францыска Скарыны і іншымі медалямі.

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1976) за паэму «Балада Брэсцкай крэпасці», Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1976) за зборнік вершаў «Рум» і кнігу перакладаў выбранай лірыкі Ф.Г.Лоркі «Блакітны звон Гранады».

Рыгор Барадулін – адзін са стваральнікаў Беларускага ПЭН-цэнтру, сябар Саюзу беларускіх пісьменнікаў, аўтар больш 70-і паэтычных зборнікаў, каля 30 зборнікаў перакладаў, крытычных артыкулаў і нарысаў.

Ягоныя творы перакладзены на чатыры дзясяткі моў.

Не стала паэта ў 2014 годдзе.



*Трэба дома бываць часцей,*
*Трэба дома бываць не госцем,*
*Каб душою не ачарсцвець,*
*Каб не страціць святое штосьці.*
*Не забыць, як падвялы аер*
*На памытай падлозе пахне,*
*Як у студню цыбаты асвер*
*Запускае руку да пахі.*
*Не забыць сцежкі той, што цябе*
*На дарогу выводзіла з дому,*
*Што ў хаце там быў рубель*
*У цане і па курсу старому.*
*Не забыць, як марозам злым*
*Клямка пальцы пячэ балюча*
*І адкуль на стале тваім*
*Бохан свежага хлеба пахучы.*
*Помніць свой на іржышчы цень,*
*Не забыць, як завуць суседа,*
*Не забыць, як пяе пад дзень*
*За вясёлым сталом бяседа.*
*Помніць кожнай масніцы спеў,*
*Кожны кут у прыціхлай хаце.*
*Лёсу дзякаваць, што паспеў*
*Ты пачуць блаславенне маці.*
*Трэба дома бываць часцей,*
*Трэба дома бываць не госцем,*
*Каб душою ты стаў чысцей*
*І не страціў святое штосьці.*

***Дарагія мае сябры, часцей бывайце дома, размаўляйце на роднай мове ды кранайцеся беларускай літаратуры…***

***Гэтага хопіць дзеля таго, “каб людзьмі звацца”….***